рад будынкам вучылішча знаходзілася «карусель» — вял. адкрыты манеж, дзе выхаванцы вучыліся верхавой яздзе, а кірасірскі ўзвод наладжваў рыцарскія турніры. Паводле хадайніцтва фундатара выхаванцы ўладкоўваліся на ваен. ці цывільную службу, а з 1785 іх адразу пасля заканчэння вучобы ўзводзілі ў ранг афіцэраў. 20.1.1797 Зорыч атрымаў званне ген.-лейт. (звольнены са службы 15.7.1797), а «вучылішча Шклоўскае» паводле ўказа ад 28.3.1797 перайшло ў казённае ведамства. Пасля прыняцця Ш.ш.в. ў казну (1799) адбыліся 4 выпускі: 7 выхаванцаў накіраваны ў чарнаморскія лінейныя батальёны, 19 — у мушкецёрскія палкі, 23 у артылерыю, 32 у гарнізонныя палкі. Пасля смерці Зорыча (6.11.1799) навуч. установа трапіла ў ведамства бел. губернатара П.І.Севярына, 28.11.1799 атрымала назву *Шклоўскі кадэцкі корпус*. Ш.ш.в. праіснавала да 1918 пад рознымі назвамі: Гродзенскі кадэцкі корпус (1800—07), Смаленскі кадэцкі корпус (1807—24), Маскоўскі кадэцкі корпус (1824—37) і інш.

*Літ.*: Лалаев [М.С.]. Исторический очерк военно-учебных заведений, подведомственных Главному их Управлению. СПб., 1880; Мельницкой Н. Сборник сведений о военно-учебных заведениях в России. Т. 1. СПб., 1857; Брыгадзін П., Лукашэвіч А. Шклоўскае шляхетнае вучылішча // Бел. мінуўшчына. 1997. № 4; Іх жа. Як шклоўскія кадэты ў Маскву трапілі // Там жа. № 6. *А.М.Лукашэвіч, А.Ф.Самусік.*

**ШКЛО́ЎСКАЯ БАЛЕ́ТНАЯ ШКО́ЛА**. Існавала ў канцы 18 ст. пры *Шклоўскім тэатры Зорыча*. Балетмайстры — П.Барцанці (да 1783), *Марыядзіні* (1780-я г.), М.*Пранчынскі* (1795—98). Сярод навучэнцаў прыгонныя з навакольных вёсак і кадэты Шклоўскага корпуса. Паводле сведчання сучасніка, 20 сял. дзяўчат, якія жылі разам у асобным будынку, атрымлівалі ў школе і агульную адукацыю: «практыкаваліся ў французскай гаворцы, чытанні, пісьме і лічэнні». Выхаванцы школы вызначаліся высокім прафес. майстэрствам. Сярод іх П. і К.*Азарэвічы*, К.*Буткевіч*, Я.*Чуцікаў* і інш.

**ШКЛО́ЎСКАЯ МУЗЫ́ЧНАЯ ШКО́ЛА**. Існавала ў канцы 18 ст. пры *Шклоўскім тэатры Зорыча*. Навучэнцы — прыгонныя са Шклова і яго ваколляў. Ігры на муз. інструментах навучалі спецыяльна запрошаныя прафес. педагогі і амаль усе музыканты, якія наведвалі Шклоў з канцэртамі. У 1782—83 музыку выкладала піяністка і спявачка Э.Саж, у 1783 — прыдворны музыкант А.Баргезі, які прыязджаў з Пецярбурга. Паводле некат. звестак, найб. здольных аддавалі вучыцца ў Пецярбург да «камер-музыканта» А.Булата. З навучаных музыцы былі створаны рагавы аркестр, «музыка шклоўскага корпуса» (24 чал.); пасля 1781 прыгонныя ўваходзілі ў тэатр. аркестр, які спачатку складаўся з іншаземцаў. З 1781 капельмайстар беларус П.Пётух вучыў вакальнаму майстэрству хлапчукоў, якія потым спявалі ў тэатр. хоры. *В.П.Пракапцова.*

**ШКЛО́ЎСКАЯ ПАПЯРО́ВАЯ ФА́БРЫКА** «Спартак». Засн. ў 1890 у г. *Шклоў* як кардонная і папяровая ф-ка. Выпускала драўняную масу, кардон, паперу каляровую, абгортачную шэрую фінляндскую, курыльную, папяросную, капіравальную і інш. У 1908 пераабсталявана на вытв-сць папяроснай паперы. У 1910 мела 5 паравых, 2 нафтавыя, 3 паперарэзальныя, 3 папяраробныя машыны, апрэтурнае аддзяленне. Працавала ад 90 да 400 чал. У 1918 нацыяналізавана і названа «Спартак», забяспечвала паперай тытунёвыя ф-кі Масквы і С.-Пецярбурга. У Вял. Айч. вайну абсталяванне ф-кі эвакуіравана ў Кіраўскую вобл. Аднавіла работу ў Шклове ў 1947. У 1957 пабудаваны папераробны цэх. У 1975—76 устаноўлена абсталяванне для вытв-сці падпергаменту. З 1993 адкрытае акц. таварыства. Асн. прадукцыя (2003): падпергамент, папера для гафрыравання, кардон для плоскіх слаёў, гафракардон і тара з яго, папера абгортачная, спецупаковачная, туалетная, сурвэткі і інш.

**ШКЛО́ЎСКАЯ ПРААБРАЖЭ́НСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры эклектыкі ў г. Шклоў Магілёўскай вобл. Пабудавана ў пач. 20 ст. з цэглы. Храм крыжападобны ў плане, цэнтрычнай кампазіцыі, мае элементы стыляў псеўдавізант. і мадэрн. Над сяродкрыжжам узвышаецца вял. 8-гранны светлавы барабан, накрыты гранёным шлемападобным купалам. Паміж рамёнамі (канцамі крыжа) убудаваны 4 квадратныя ў плане 3-ярусныя вежападобныя аб'ёмы. Верхнія 8-гранныя ярусы са скразнымі праёмамі завершаны гранёнымі купаламі. Розныя вышыні аб'ёму надаюць будынку верт. дынаміку. Усе фасады вырашаны з яскрава выяўленай сіметрыяй, падкрэсленай восевым размяшчэннем уваходаў, над якімі па 2 аконныя праёмы з арачнымі завяршэннямі. Іх матыў паўтараюць вял. аркі накшталт закамараў у завяршэнні сцен. Фасады аздабляюць тонкія прафіляваныя карнізныя цягі, пілястры, плоскія нішы. *Т.В.Габрусь.*

**ШКЛО́ЎСКАЯ РА́ТУША**, помнік архітэктуры класіцызму ў г. Шклоў Магілёўскай вобл. Пабудавана ў канцы 18 ст. ў комплексе з гандл. радамі. Ратуша — 2-павярховы, амаль квадратны ў плане мураваны будынак з вальмавым дахам, завяршаўся 2-ярусная 8-граннай вежай, увянчанай гранёным купалам са шпілем. 1-ы паверх у цэнтры быў прарэзаны шырокім праездам у двор гандл. радоў. Аднапавярховыя (з 2-павярховымі квадратнымі ў плане аб'ёмамі па вуглах і сіметрычна пастаўленым падобным да ратушы будынкам) гандл. рады разам з ратушай утваралі прамавугольны двор, які меў 3 уязныя брамы. Фасады рытмічна расчлянёны шырокімі лапаткамі, прамавугольнымі аконнымі праёмамі і паўцыркульнымі аркадамі. Гандл. рады пашкоджаны ў Вял. Айч. вайну. Адноўлена ў 2000. *У.А.Чантурыя.*



**Шклоўская ратуша**. Чарцёж.



**Шклоўская Праабражэнская царква**.



**Шклоўская ратуша**. Сучасны выгляд.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУ